Біблія для дзяцей
прадстаўляе

# Першы Вялікдзень



Аўтар: Edward Hughes

Ілюстратар: Janie Forest; Alastair Paterson

Адаптаваў: Lyn Doerksen

Пераклаў: Christian Lingua

Выдавец: Bible for Children
www.M1914.org

©2020 Bible for Children, Inc.
Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).

Жанчына стаяла на шумным схіле пагорка. Яе заплаканыя вочы назіралі страшэнную сцэну. Яе сын паміраў.



Маці звалі Марыя,
і яна стаяла
побач з тым
месцам, дзе
Ісус быў
прыбіты
да крыжа.





Як усё гэта здарылася? Як Ісус мог скончыць такое выдатнае жыццё такім жудасным чынам?



Як Бог мог дазволіць, што Яго Сын быў прыбіты да крыжа, каб памерці там? А можа, Ісус памыліўся наконт таго, Хто Ён? Хіба Бог пацярпеў паразу?



Не! Бог не прайграў. Ісус не зрабіў ніводнай памылкі. Ісус заўжды ведаў, што бязбожныя людзі аддадуць Яго на смерць. Нават калі Ісус быў дзіцём, стары чалавек Сімяон сказаў Марыі, што яе чакае смутак.



За некалькі дзён да таго, як Ісус быў забіты, у дом, дзе Ён знаходзіўся, прыйшла жанчына і выліла духмяную мазь на Яго ногі.



“Яна змарнавала грошы” - скардзіліся вучні. “Яна зрабіла добрую справу”, - сказаў Ісус, - “Яна зрабіла гэта для майго пахавання”. Якія дзіўныя словы!

Пасля гэтага Юда, адзін з дванаццаці вучняў Ісуса, пагадзіўся выдаць Яго першасвятарам за 30 кавалкаў срэбра.





Падчас габрэйскага Вялікоднага свята, Ісус апошні раз еў з Яго вучнямі. Ён расказаў ім дзіўныя рэчы пра Бога і Божыя абяцанні для тых, хто Яго любіць.





Тады Ісус падзяліў
з імі хлеб і кубак.
Гэтыя сімвалы павінны
былі нагадваць ім, што
цела і кроў Ісуса былі
ахвяраваныя, каб
прынесці
прабачэнне
за грахі.

Потым Ісус сказаў сваім сябрам, што адбудзецца здрада, і Ён будзе выданы Сваім ворагам. Амаль усе вучні ўцяклі. "Я не буду нікуды ўцякаць" - настойваў Петр.



“Перш, чым заспявае певень, ты тройчы зрачэшся Мяне” - сказаў Ісус.





Пазней гэтай ноччу Ісус пайшоў маліцца ў Гефсіманскі сад. Вучні, якія былі з Ім, заснулі. "Мой Ойча", - маліўся Ісус, - "хай абміне Мяне гэты кубак. Тым не менш, не як Я хачу, але як Ты..."

Раптоўна ў сад уварваўся натоўп на чале з Юдай. Ісус не супраціўляўся, аднак Пётр адсек мячом вуха аднаму чалавеку. Ісус спакойна дакрануўся да вуха гэтага чалавека і вылечыў яго. Ісус ведаў, што Ягоны арышт быў часткай Божай волі.



Натоўп пацягнуў Ісуса ў дом першасвятара. Там габрэйскія лідары заявілі, што Ісус павінен памерці.



Пётр стаяў побач з агнём слуг і глядзеў на тое, што адбывалася.



Тры разы людзі глядзелі на Пятра і казалі:


"Ты таксама быў з Ісусам!"
Тройчы Пётр адмаўляў
гэта, – так, як
прадказаў Ісус.
Пётр нават
пакляўся,
што не
ведае Яго.

# КУ-КА-РЭ-КУ



У той самы момант заспяваў певень, і гэта быў быццам Божы голас для Пятра.  Пётр згадаў словы Ісуса і горка заплакаў.


Юда таксама пашкадаваў пра зроблeнае. Ён ведаў, што Ісус не быў вінаваты ў аніякім граху ці злачынстве.


Юда прынёс назад 30 кавалкаў срэбра, але
святары не захацелі прымаць.


Юда кінуў
грошы,
выйшаў – і
павесіўся.


Габрэйскія святары прывялі Ісуса да Пілата, рымскага кіраўніка.
Пілат урэшце сказаў:


"Я не знаходжу ніякай віны ў гэтым Чалавеку". Але натоўп працягваў крычаць: "Крыжуй Яго! Крыжуй Яго!"

Нарэшце Пілат здаўся, і прысудзіў Ісуса да смерці на крыжы. Салдаты білі Ісуса ў твар, плявалі ў Яго і збівалі бізуном.





У сваёй жорсткасці яны зрабілі вянок з доўгімі вострымі шыпамі і прыціснулі яго да галавы Ісуса. Потым яны прыбілі Яго да драўлянага крыжа, каб там Ён і памер.



Ісус заўсёды ведаў, што
памрэ менавіта так. Ён
таксама ведаў, што
Яго смерць
прынясе
прабачэнне
грэшнікам, якія
спадзяюцца
на Яго.





Побач з Ісусам
былі таксама
ўкрыжаваныя
два злачынцы.
Адзін паверыў у
Ісуса і пайшоў у
рай, а іншы - не.


Пасля некалькіх гадзін пакутаў, Ісус сказаў: “Збылося!” – і памер. Яго справа была завершана.
Сябры пахавалі Яго ў прыватнай грабніцы.


Тады рымскія салдаты паставілі на грабніцу пячатку і ахоўвалі яе.

Цяпер ніхто не мог патрапіць унутр ці выйсці вонкі.




Калі б гэта быў канец гісторыі, гэта было б дужа сумна.
Але Бог зрабіў нешта цудоўнае.
Ісус не застаўся мёртвым!


Рана раніцай, у першы дзень тыдня, некаторыя з вучняў Ісуса знайшлі камень,
адвалены ад магілы. Калі яны зазірнулі ўнутр, Ісуса там больш не было.

Адна жанчына засталася, плачучы над труною. Ісус з’явіўся ёй!



Яна радасна кінулася назад сказаць іншым вучням: "ІСУС ЖЫВЫ! ІСУС УВАСКРЭС З МЁРТВЫХ!"



# Неўзабаве Ісус прыйшоў

да вучняў, і паказаў ім рукі, зраненыя цвікамі. Гэта было праўдай. ІСУС ЗНОЎ БЫЎ ЖЫВЫ! Ён прабачыў Пятра за тое, што той зрокся Яго. Ісус сказаў Сваім вучням, каб яны распавялі пра Яго ўсім. Потым Ён вярнуўся на нябёсы, адкуль прыйшоў.

Першы Вялікдзень

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Мацвея 26-28, Лукі 22-24,
Яна 13-21

“Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе.”
Псалтыр 119:130


Канец

Гэтая Біблейская гісторыя распавядае нам пра цудоўнага Бога, Які стварыў нас, і хоча, каб вы ведалі Яго.

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх ёсць смерць, але Бог любіць вас так моцна, што Ён паслаў Свайго адзінага Сына, Ісуса, памерці на крыжы і панесці пакаранне за вашыя грахі. Потым Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся дадому, на нябёсы! Калі вы паверыце ў Ісуса і папросіце Яго прабачыць вашыя грахі, Ён зробіць гэта! Ён прыйдзе і цяпер будзе жыць унутры вас, а вы будзеце жыць з Ім вечна.

Калі вы верыце, што гэта праўдзіва, скажыце Богу наступнае: Дарагі Ісус, я веру, што Ты Бог і стаў чалавекам, каб памерці за мае грахі, і цяпер Ты зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, і аднойчы прыйсці да Цябе, каб быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне слухацца Цябе і жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін.

Чытай Біблію і размаўляй з Богам кожны дзень! Ян 3:16